УДК 94(476)

# Беларускія медыкі-навукоўцы ў кантэксце развіцця еўрапейскай медыцыны ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

**Бездзель В.Я., Хаданёнак В.М.**
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", Віцебск*

*2017 год абʼяўлены Годам навукі. Гэтая акалічнасць падштурхнула аўтараў звярнуцца да пытання станаўлення розных накірункаў айчыннай навукі, у тым ліку і медыцынскай. Тым больш, што многія медыкі – ураджэнцы беларускіх губерній, добра вядомыя адкрыццямі ў вобласці практычнай медыцыны.*

*Мэта артыкула – ахарактарызаваць стан медыцынскай навукі ў беларускіх губернях у кантэксце еўрапейскіх тэндэнцый развіцця медыцыны.*

***Матэрыял і метады.** Даследаванне падрыхтавана па матэрыялах перыядычнага друку і аўтарэфератаў дысертацый, прысвечаных пытанням станаўлення медыцынскай адукацыі на беларускіх землях, артыкулаў энцыклапедычных даведнікаў і біяграфічных слоўнікаў пачатку XX ст. Для дасягнення пастаўленай мэты і задач выкарыстоўваліся такія спецыяльна-навуковыя метады, як гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-тыпалагічны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Увага надаецца станаўленню медыцынскай адукацыі на землях Рэчы Паспалітай. Першапачаткова выкладчыцка-прафесарскі кантынгент запрашаўся з еўрапейскіх краін. Аднак ужо ў першай палове XIX стагоддзя адбылося станаўленне ўласнай медыцынскай школы. Яе прадстаўнікі значна пашырылі веды еўрапейцаў у вобласці хірургіі, бальнеалогіі, таксікалогіі.*

***Заключэнне.** Зроблены вывад аб паспяховасці працы медыцынскага факультэта спачатку Віленскага ўніверсітэта, потым Медыка-хірургічнай акадэміі, нягледзячы на кароткі час іх існавання.*

***Ключавыя словы:** Віленскі ўніверсітэт, медыцына, А. Тызенгаўз, Ж. Жылібер, А.Ф.В. Адамовіч, А.І. Абіхт, В.В. Пелікан, Я.В. Пелікан, К.І. Грум-Гржымайла.*

# Belarusian Medical Scientists in the Context of the Development of European Medicine in the Late XVIIIth – early XIXth Centuries

**Bezdel V.Ya., Khadanyonak V.M.**
*Education Establishment "Vitebsk State Technological University", Vitebsk*

*2017 year was declared the year of science. This motivated the authors to turn to the history of national science including medicine. More over many of the medical scientists born in Belarusian governorates, who made discoveries in applied medicine, remain unknown to Belarusians.*

*The purpose of this article is to describe the state of medical science in Belarusian governorates against the backdrop of European tendencies in medical science development.*

***Material and methods.** The article relies on scientific and media publications by Belarusian and Russian authors: dissertation abstracts on issues of medical education, encyclopedia articles and biography dictionaries of the early XXth century. To achieve the goal special research methods were used: the historical and genetic, the historical and system and the historical and typological.*

***Findings and their discussion.** The establishment of medical education in Polish–Lithuanian Commonwealth is in the focus of this article. Initially lecturers and professors were invited from European countries. However in the first half of the XIXth century an independent medical school was formed. Its representatives made considerable contributions to the European knowledge in surgery, balneology, and toxicology.*

***Conclusion.*** *It is concluded, that despite the short time of their operation, the work of Vilnius University Medical Faculty first, and later of the Medical and Surgery Academy was successful.*
***Key words:*** *Vilnius University, medical science, A. Tyzengaus, Zh. Zhyliber, A.F.V. Adamovich, A.I. Abikht, V.V. Pelikan, Y.V. Pelikan, K.I. Grum-Grzhymayla.*